This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2022.pp.133-153

Przegląd Środkowo-Wschodni, 7, 2022
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20220707

Data przesłania: 06.04.2022
Data akceptacji: 30.04.2022

**Анатоль Вялікі**
Instytut Historii Nauki Polskiej Akademii Nauk
akoidanov@yahoo.com
ORCID: 0000-0001-7160-6366

# Беларуска-польскае культурнае супрацоўніцтва ў сярэдзіне-канцы 1950-х гг.

**Białorusko-polska współpraca kulturalna w drugiej połowie lat 50. XX wieku**

Charakterystyczną cechą stosunków białorusko-polskich w połowie końca lat 50. była współpraca kulturalna. Należy to tłumaczyć wspólnymi więzami historycznymi, geograficznymi, językowymi i rodzinnymi między narodami polskim i białoruskim. Jednocześnie panująca w ZSRR zasada „socjalistycznego realizmu" wpłynęła na rozwój stosunków kulturalnych. Charakterystyczną cechą wymiany kulturalnej między narodami polskim i białoruskim było unikanie ostrych tematów. Znikome miejsce języka białoruskiego w życiu kulturalnym Białorusi sprawiło, że czytelnik polski nie odróżniał białoruskiej kultury sowieckiej od procesów ogólnozwiązkowych i kulturowych, jakie miały miejsce w ZSRR.

Słowa kluczowe: białorusko-polskie więzi kulturowe, „socjalistyczny realizm", Dni Kultury Białoruskiej, społeczeństwo białorusko-polskie, wymiana kulturalna

Адным з важнейшых кірункаў беларуска-польскіх узаемаадносін стала развіццё беларуска-польскага супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, якія мелі свае этапы і дынаміку. Яго можна падзяліць на два нераўназначныя этапы. Першы – 1944–1952 гг., другі – 1952–1959 гг. Першы этап характарызуецца поўнай адсутнасцю якіх небудзь сувязей. «Замарожанае» у гады «халоднай

вайны» супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі непазбежна пераносілася і на культурныя узаемадачыненні.

Другі этап – 1952–1959 гг. адзначаецца пашырэннем і паглыбленнем гуманітарнага супрацоўніцтва, якоя станавілася адным з важнейшых ва ўзаемаадносінах паміж сацыялістычнымі краінамі.

Развіццё культурных сувязей патрабавала стварэння арганізацыі, якая б ажыццяўляла арганізацыю гэтай работы на рэспубліканскім і рэгіянальным узроўнях. Такой арганізацыяй стала Беларускае таварыства культурнай сувязі з заграніцай (БТКСЗ), створаная ў красавіку1952 г.[1], адной з галоўных задач якога з’яўлялася пашырэнне культурных сувязей БССР з краінамі «народнай дэмакратыі», у тым ліку і з ПНР.

Разам з тым, неабходна адзначыць, што на пачатку 1950-х г. устанаўленне культурных сувязей з “краінамі народнай дэмакратыі” ажыццяўлялася толькі з дазволу Масквы. Міністр замежных спраў Кузьма Кісялеў паведамляў 5 жніўня 1953 г. першаму сакратару ЦК КП(б)Б Мікалаю Патолічаву, што ў час яго візіту ў Польшчу і перамоваў з членамі ўраду, ім ініцыіравалася пытанне аб пашырэнні культурных сувязей БССР з Польшчай. Далей ён падкрэсліў, што аб перамовах і яго прапановах ён інфармаваў Міністра замежных спраў СССР Вячеслава Молатава, які “адобрыў мае прапановы”[2]. У сувязі з гэтым К. Кісялёў хадайнічаў перад М. Патолічавым аб накіраванні ў Польшчу ў канцы 1953 г. творчыя калектывы, пісьменнікаў і мастакоў.

Польскі бок таксама выказваў зацікаўленасць у пашырэнні культурнага супрацоўніцтва. Упаўнаважаны ВОКС у Польшчы Іван Рачук накіраваў Старшыні Праўлення БТКС Гаўрылу Верасаву выпіску з размовы з сакратаром ЦК ПАРП Эдвардам Ахабам, у якой падкрэсліваў, што апошні выказаў зацікаўленасць

---

[1]. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 914, воп. 2, спр. 20, л. 16.
[2] Тамсама, л. 35.

прапагандзіраваць у Польшчы дасягненні навукі і культуры украінскага і беларускага народаў. Выказаў пажаданне і зварот да Украінскага і Беларускага таварыстваў культурнай сувязі дасылаць навінкі літаратуры і мастацтва, што будзе разглядацца як выключна важнае мерапрыемства па культурнаму супрацоўніцтву паміж украінскім і беларускім народамі[3].

Адначым, што «Таварыства…» значна актывізіравала культурныя сувязі з сацыялістычнымі краінамі з моманту свайго стварэння ў 1952 г. З 1952 па 1955 гг. былі ўсталяваны сувязі з 36 арганізацыямі з 23 краін. Польшча займала першае месца па інтэнсіўнасці абмену, прыёму дэлегацый, правядзенню розных культурных мерапрыемстваў. Так, за гэтыя гады Беларусь наведалі з Польшчы 20 дэлегацый, Кітаю – 8, Чэхаславакіі – 6, Венгрыі – 6, Фінляндыі – 6, Канады – 5, ГДР – 5, Францыі – 4, Румыніі – 2, Албаніі – 2, Карэі – 2, Італіі – 2, Англіі – 2, Японіі – 2, Уругвая – 2 і астатнія краіны па аднаму разу[4].

У справаздачы «Таварыства…» за 1955 г. адзначалася, што

> Асноўная ўвага БТКСЗ надавала справе ўмацавання культурных сувязей з Польскай Народнай Рэспублікай. Намагаючыся шырока актывізаваць беларуска-польскія сувязі, Праўленне БТКСЗ улічвала гістарычна склаўшыяся адносіны сяброўства паміж польскім і беларускімі народамі, непасрэднае суседства двух братніх рэспублік, падабенства геаграфічных і кліматычных умоў і адсюль падабенства шэрагу народана-гаспадарчых праблем[5].

Заўважым, што дзейнасць па пашырэнню гуманітарных сувязей мела важную грамадска-палітычную скіраванасць. Красамоўна об гэтым сведчыць прызнанне ЦК ПАРП, што

---

[3] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 34, л. 21.

[4] Архив Министерства иностранных дел Республики Беларусь (АМИД РБ), ф. 3, воп. 3, спр. 341, арк. 34.

[5] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 70.

Пашырэнне польска-беларускіх сувязей будзе мець неабходнасць рашэння ўзнікшай ў Польшчы палітычнай праблемы: пераадолення маючай у часткі польскай інтэлігенцыі нацыяналістычных перажыткаў. Гэта частка польскай інтэлігенцыі сцвярджала, што ні існуе, быццам бы, украінскай і беларускай нацый, украінскай і беларускай культур. Умацаванне беларуска-польскіх сувязей істотна садзейнічала пераадоленню гэтых пагладаў[6].

Ініцыятыва аб развіцці культурных сувязей Польшчы і Беларусі зыходзіла ад польскага боку. Міністр замежных справаў К. Кісялёў 5 жніўня 1953 г., накіраваў першаму сакратару ЦК КПБ М. Патолічаву інфармацыю, у якой адзначаў, што ў час яго візіту ў Польшчу адбыліся перамовы з членамі ўрада ПНР, якія прапанавалі пашырыць культурныя сувязі паміж БССР і ПНР. К. Кісялёў таксама падкрэсліў, што ён паведаміў аб гэтых прапановах палякаў В. М. Молатаву, які пагадзіўся з гэтымі прапановамі і дазволіў накіраваць у ПНР творчыя калектывы і найбольш вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва Беларусі[7].

Паколькі Масква дазволіла развіццё культурных сувязей, то К. Кісялёў напрыканцы 1953 г. накіраваў у ЦК КПБ спіс творчых калектываў, якія неабходна было накіраваць у Польшчу: Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета, Беларускі Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатр імя Я. Купалы, Беларускі Дзяржаўны народны хор пад кіраўніцтвам Народнага артыста БССР Рыгора Шырмы, Народны хор пад кіраўніцтвам Заслужанага дзеяча культуры Г. Цітовіча. У Польшчу павінны былі ехаць пісьменнікі – Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Янка Брыль, Іван Шамякін, Піліп Пестрак, Міхась Лынькоў, скульптары – Заір Азгур, Андрэй Бембель, Р. Кудрэвіч, Васіль Цвірка, кампазітары – Яўген Цікоцкі, Аляксандр Багатыроў, М. Чуркін, архітэктары – В. Кароль, Л. Мацкевіч[8].

---

[6] НАРБ, ф. 914, воп, 2, спр. 54, л. 71.
[7] НАРБ, ф. 914, Воп. 2, спр. 34, л. 35.
[8] Там сама, л. 38, 40.

Для арганізацыі беларуска-польскага культурнага супрацоўніцтва дэлегацыя ТПСС з 14 верасня па 6 кастрычніка 1954 г. наведала БССР. Яе мэтай з'яўлялася:

> Вывучэнне беларускай культуры і далейшай прапаганды дасягненняў нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце культуры БССР у мэтах пераадолення маючыхся сярод часткі польскай інтэлігенцыі нацыяналістычных поглядаў, адмаўленне існавання беларускай культуры і самой беларускай нацыі, вызначэнне канкрэтных культурных сувязей паміж ПНР і БССР[9].

Дэлегацыя пабывала ў Мінску, Гомелі, Магілёве, Гродна, Брэсце, Бабруйску, Слуцку, Наваградку, наведала ў гэтых гарадах прадпрыемствы, установы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, сустракалася з прадстаўнікамі і кіраўнікамі партыйна-савецкіх, грамадскіх, культурных устаноў і арганізацый і г. д. Кіраўнік польскай дэлегацыі Генрык Яблонскі выказаў прапановы аб правядзенні ў Польшчы дзён беларускай культуры, пашырэнні работы па выданні ў Польшчы твораў беларускіх, а ў Беларусі польскіх аўтараў, арганізацыі абмену дакументальнымі кіначасопісамі, накіраваннем у Польшчу матарыялаў аб БССР (артыкулаў, фотаздымкаў і г. д.), арганізацыі ў ПНР выставак твораў мастацтва і народнай творчасці[10]. Больш таго, у час візіту старшыня ТПСС Ксенжак і дырэктар інстытута тэхнічных праблем Польскай Акадэміі Навук прафесар Малецкі прапанавалі неабходнасць правядзення дэкады беларускай культуры ў Польшчы[11].

Адзначым, што наведванне дэлегацыямі ТПСС Беларусі не выходзіла за рамкі афіцыйных сустрэч і праграмы візіту. Так, дэлегацыя ТПСС, якая ў ліпені 1956 г. знаходзілася ў Гродзенскай вобласці, у час візіту наведала калгас імя Сталіна Любчанскага раёна,

---

[9] У. І. Навіцкі, *Беларуска–польскія культурныя сувязі (сярэдзіна 50-х – сярэдзіна 80-х гг. XX ст.)* [в:] *XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў: матэрыялы. беларуска–польскай навук. канф.,* Мінск, 20–21 лістапада 2000 г., с. 215.

[10] Тамсама, с. 216.

[11] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 27.

правяла сустрэчу са старшынёй Навагрудскага райвыканкама, азнаёмілася з працай Навагрудскага дома культуры і наведала мясціны, якія былі звязаны з жыццём Адама Міцкевіча. Пасля гэтага дэлегацыя выехала ў Мінск, дзе наведала абутковую фабрыку, пабывала ў музеі Вялікай Айчыннай вайны і г. д. Аднак у час візіту палякі не сустрэліся са сваімі суайчыннікамі-палякамі.

Вярнуўшыся ў ПНР польская дэлегацыя ўнесла ў ТПСС і ЦК ПАРП прапановы аб мерах умацавання польска-беларускіх культурных сувязей, і, у прыватнасці, прапановы аб правяденні ў Польшчы Дзён беларускай культуры. Пазней пытанні, якія дытычылі правядзення Дзён абмяркоўваліся старшынем БТКСЗ Г. Верасавым з міністрам культуры ПНР Сакорскім і кіраўніцтвам ТПСС у Варшаве[12].

Галоўнае праўленне ТПСС накіравала БТКСЗ прапановы аб развіцці і паглыбленні культурнага супрацоўніцтва. ТПСС прапанавала творчым саюзам, грамадскім аб'яднанням, культурна-асветніцкім установам Польшчы накіраваць у ТПСС прапановы аб асноўных сферах такога супрацоўніцтва, якія закраналі наступныя кірункі: літаратуру, музыку, мастацтва, кіно, тэатр[13]. Падкрэслівалася неабходнасць пасылкі ў Польшчу п'ес беларускіх аўтараў для пастаноўкі ў Польшчы, анталогіі беларускай паэзіі і лепшых твораў вядомых беларускіх паэтаў, выстаўкі беларускай графікі, жывапісу і скульптуры, збораў твораў Я. Купалы і Я. Коласа, выбраных беларускіх народных песень, сімфанічных твораў для выканання на канцэртах.

Адным з першых шырокамаштабных культурных мерапрыемстваў, дзе была прадстаўлена беларуская культура ў ПНР, стаў месячнік польска-савецкага сяброўства восенню 1955 г., а ў яго рамках правядзенне «Дзён беларускай культуры».

Паколькі месячнікі савецка-польскай дружбы праводзіліся штогадова, то ЦК ПАРП паведамілі паслу СССР у Польшчы Панцеляй-

[12] Там сама, л. 78.

[13] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 87, л. 203.

мону Панамарэнку аб гэтым. У сваю чаргу, ён накіраваў у ЦК КПБ ліст, у якім паведамляў, што:

> ЦК ПАРП 30 мая прыняў рашэнне аб правядзенні ў Польшчы з 9 верасня па 9 кастрычніка месячніка польска-савецкага сяброўства. У адпаведнасці з гэтым рашэннем у перыяд месячніка будзе праведзена з 30 верасня па 9 кастрычніка дэкада беларускай літаратуры і мастацтва пад назвай «Дні беларускай культуры». Надаючы вялікае значэнне гэтаму грамадска-палітычнаму мерапрыемству, польскія таварышы рашылі выдаць на польскай мове 5–6 лепшых твораў беларускіх пісьменнікаў, 2–3 многаактныя п'есы, 2-а зборнікі аднаактных п'ес, песеннік беларускіх народных і сучасных песен [...]. Аднак у сувязі з недахопам неабходных матэрыялаў польскія таварышы сустрэліся з вялікімі цяжкасцямі і звярнуліся да нас з просьбай дапамагчы ў атрыманні беларускіх кніг, пласцінак, фільмаў, альбомаў і г.д. Улічваючы зварот польскіх таварышаў, прашу Вас аказаць садзейнічанне ў накіраванні ў бліжэйшы час у ПНР наступных матэрыялаў: некалькіх кніг многаактных і аднаактных п'ес, 10 партытур музычальных твораў беларускіх кампазітараў. Некалькі зборнікаў беларускіх народных і сучасных песен, 20–25 камплектаў пласцінак з запісамі беларускіх народных песен, танцаў, камернай і эстраднай музыкі, 30–40 мастацкіх альбомаў, прысвечаных Мінску і БССР, а таксама рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў, 25 партрэтаў фотавыставак, лепшыя беларускія мастацкія, дакументальныя і хранікальныя фільмы. Разам з тым, лічу неабходным паведаміць Вам аб тым, што польскія таварышы, прапаноўваюць запрасіць з Беларускай ССР: дэлегацыю дзеячаў культуры, Дзяржаўны беларускі тэатр імя Я.Купалы, Беларускі дзяржаўны народны хор, групу салістаў, спартыўную каманду, а таксама выстаўку выяўленчага мастацтва і народнай творчасці БССР, выстаўку кніг і графікі. Меркаванні пасольства па гэтаму пытанню паведамім Вам пасля прыняцця польскімі таварышамі канчатковага рашэння[14].

Як вынікае з ліста П. Панамарэнкі, «польскія таварышы» добра ўяўлялі савецкую рэчаіснасць, бо ігнаруючы МЗС БССР, звяр-

---

[14] НАРБ, ф. 4п, воп. 97, спр. 10, л. 117.

нуліся ў пасольства СССР у Польшчы. Гэта паказвае, што Беларусь была адхілена ад прыняцця рашэнняў у галіне культурнага абмена, а толькі выконвала тыя рашэнні, якія прымаліся ўсесаюзнымі органамі.

Напярэдадні яго адкрыцця «Дзён…» ў польскай прэсе шырока асвятляліся дасягненні беларускай культуры. Газета Саюза польскіх пісьменнікаў «Нова культура» прысвяціла тэматычны нумар агляду беларускай літаратуры і пазнаёміла польскіх чытачоў з вершамі Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, М. Танка і іншых паэтаў Беларусі. Падкрэслівалася, што на польскай мове былі выдадзены шматлікія творы пісьменнікаў – Я. Коласа, М. Танка, М. Лынькова, П. Броўкі і інш.[15] Аднак гэта была значна перабольшаная інфармацыя, якой прытрымліваліся і ў наступныя гады. Так, у манаграфіі, выдадзенай беларускімі гісторыкамі ў 1970 г., сцвярджалася, што:

> У Польскай Народнай Рэспубліцы за 1945–1958 гг. было пераведзена – 160 работ беларускіх аўтараў, у тым ліку і асобныя творы беларускай народнай творчасці. 55 твораў Максіма Танка, напрыклад, друкаваліся 15 разоў, а агульная колькасць публікацый твораў беларускіх аўтараў у Польшчы за гэтыя гады дасягнула амаль 300[16].

Разам з тым, паводле інфармацыі БТКСЗ, за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1945 па 1955 г.) на польскую мову было перакладзена толькі 8 пазіцый беларускай літаратуры, поўнасцю адсутнічалі пераклады беларускіх аўтараў на польскую мову, не дэманстравалася ні аднаго беларускага фільма[17].

У час «Дзён беларускай культуры» ў Польшу прыехалі П. Броўка, М. Танк, А. Куляшоў, П. Пестрак, Я. Брыль і І. Шамякін. У Варшаву на гастролі адправіўся Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, які, як планавалася, акрамя Варшавы выступіць

---

[15] "Советская Белоруссия" 1955, 30 сентября.

[16] С. Войтович, *Сотрудничество Белорусской ССР с социалистическими странами* Минск 1970, с. 174.

[17] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 89, л. 40.

у Лодзі і Беластоку, а таксама група салістаў Беларускага дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета[18]. Увесь працэс падрыхтоўкі да «Дзён беларускай культуры» знаходзіўся пад кантролем бюро ЦК КПБ, якое прымала рашэнне па кожным калектыве, асобным пісьменніку, паэту, а таксама мастацкіх творах, якія павінны былі быць прадстаўлены ў Польшчы[19]. У ПНР актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні «Дзён… » ажыццяўляла ТПСС, якое адзначала, што Таварыства польска-савецкага сяброўства «*Ажыццяўляе пасрэдніцтва ва ўстанаўленні кантактаў паміж навуковымі і культурнымі ўстановамі Польшчы і БССР*»[20].

30 верасня 1955 г. у Варшаве ў прысутнасці вышэйшага палітычнага і дзяржаўнага кіраўніцтва Польшчы, прадстаўнікоў дыпламатычнага корпусу былі ўрачыста адкрыты «Дні беларускай культуры». З нагоды гэтай падзеі з дакладам выступілі міністр культуры ПНР В. Сакорскі, а з беларускага боку – Міністр культуры БССР Я. Кісялёў, якія адзначылі, што дні беларускай культуры будуць спрыяць умацаванню сяброўства і развіццю культурнага супрацоўніцтва паміж беларускім і польскім народамі[21]. Беларуская і польская прэса падкрэслівалі, што ўпершыню за пасляваенны час у Польшчы праходзіць дэкада беларускай культуры, што, несумненна, будзе спрыяць умацаванню сяброўства і прыязні паміж беларускім і польскім народамі[22]. Культурныя мерапрыемствы адбыліся і ў іншых гарадах Польшчы.

Беларуская прэса, асвятляючы дні беларускай культуры ў ПНР адзначала, што польскія ўлады шмат робяць для задавальнення нацыянальна-культурных патрэб беларусаў, як нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Так, напрыклад, старшыня Беластоцкага ваяводскага праўлення Таварыства польска-савецкага сяброўства

---

[18] «Советская Белоруссия» 1955, 30 сентября.
[19] НАРБ, ф. 4п, воп. 73, спр. 67, л. 193–195.
[20] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 89, л. 40.
[21] «Советская Белоруссия» 1955, 1 октября.
[22] «Советская Белоруссия» 1955, 5 октября.

адзначыў, што «*Беларусы, якія жывуць у Польшчы акружаны сардэчнай увагай. На тэрыторыі ваяводства маецца 56 беларускіх школ. У 98 школах адным з асноўных прадметаў з'яўляецца беларуска мова*» [23]. Адзначым, што ў БССР па стану на сярэдзіну 1950-х гг. не мелася ніводнай польскамоўнай школы.

Польская прэса таксама надавала значную ўвагу асвятленню правядзення дней беларускай культуры ў ПНР. Адзначалася, што ў многіх гарадах Польшчы – Варшаве, Познані, Беластоку, Уроцлаве, Зялёнай Гуры ды іншых выступаюць беларускія артысты, пісьменікі, паэты. «Жыцэ Варшавы» падкрэслівала, што ўпершыню за пасляваенны час ў Польшчы праходзіць дэкада беларускай культуры, што, несумненна, будзе спрыяць умацаванню сяброўства і прыязні паміж беларускім і польскім народамі[24].

Газета Саюза польскіх пісьменнікаў «Нова культура» прысвяціла цэлы нумар агляду беларускай літаратуры. Яніна Бранеўская надрукавала ў ёй артыкул «Блізкая нам Беларусь», які расказваў аб камуністычным будаўніцтве ў БССР, Л. Бартэльскі ў артыкуле «Новае і старое», паказаў намаганні беларускага народа па аднаўленню Мінска. Газета пазнаёміла польскіх чытачоў з вершамі Я. Купалы, Я. Коласа, А. Куляшова, М. Танка ды іншых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі Беларусі[25].

Да «Дзён беларускай культуры» у Польшчы было выдадзена вялікая колькасць прапагандысцкіх матарыялаў. Так, тыраж спецыяльнага нумара бібліятэкі ТПСС пад назвай «Брацкая Беларуская Рэспубліка» склаў 20 тыс. экзэмпляраў, спецыяльны нумар часопіса «Культурна-асветніцкая работа» прысвечаны БССР выйшаў накладам 13 тыс. экзэмпляраў. Не меншымі накладамі выходзілі і іншыя выданні парпагандысцкага характару[26].

[23] «Советская Белоруссия» 1955, 8 октября.
[24] «Советская Белоруссия» 1955, 5 октября.
[25] «Советская Белоруссия» 1955, 30 сентября.
[26] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 81.

Аднак не абыйшлося і без крытычных заўваг з боку польскіх творчых кол. Так, шэраг польскіх газет апублікаваў крытычныя рэцэнзіі на спектаклі імя Я. Купалы і яго рэпертуар, у прыватнасці крытыцы падвергліся п'есы «Канстанцін Заслонаў» і «Пяюць жаваранкі». Так, у артыкуле Шыдлоўскага «Беларускі тэатр у Варшаве», які быў надрукаваны ў газеце «Трыбуна люду», адзначалася, што фабула п'есы вельмі павярхоўная, людзі ў ёй аднавобразныя і плакатныя. У артыкуле К. Бярвінскай «Тэатр сумленных артыстаў», апублікаванай у газеце «Нова культура», адзначаецца, што п'еса «Пяюць жаваранкі» можа служыцць узорам схематызма і безканфліктнасці[27].

«Дні беларускай культуры» завяршыліся вялікім канцэртам, які быў дадзены беларускімі артыстамі ў Варшаўскай дзяржаўнай оперы. Значнасць мерапрыемстваў падкрэслівалася тым, што на канцэрце прысутнічалі кіраўнікі Польшчы – першы сакратар ЦК ПАРП Баляслаў Берут, Старшыня Дзяржаўнага Савета Аляксандр Завадскі, Старшыня СМ ПНР Юзаф Цыранкевіч, члены палітбюро ЦК ПАРП Якуб Берман, Эдвард Охаб, міністр замежных спраў Станіслаў Скжэшэўскі і іншыя партыйныя і дзяржаўныя дзеячы Польшчы[28].

Галоўнае праўленне ТПСС высока ацэньвала вынікі правядзення Дзён беларускай культуры і адзначала:

> Дні беларускай культуры сталі пачаткам шырокай папулярызацыі дасягненняў Беларусі, спрыялі паглыбленню нашага сяброўства с сардэчным, блізкім нам брацкім беларускім народам. Па ўсей краіне адбыліся мастацкія канцэрты, вечарынкі і вечары беларускай паэзіі, прысвечанныя культурным, палітычным і гаспадарчым дасягненням Беларускай рэспублікі. […] Напрыклад, у Сталінагродскім ваяводстве было арганізавана 476 мерапрыемстваў, у якіх удзельнічала 70 503 чалавекі. У Зеленагурскім ваяводстве адбылося 820 лекцый па беларускай праблематыцы, якія праслухалі больш 42 тыс. чалавек[29].

---

[27] Тамсама, л. 81.

[28] "Советская Белоруссия" 1955, 11 октября.

[29] *Документы и материалы по истории советско-польских отношений Т.X. январь 1950 г. – декабрь 1955 г.* Москва 1980, с. 474.

У Познаньскім ваяводстве было праведзена больш за 50 літаратурных вечароў, на якіх выступалі беларускія пісьменнікі[30].

Пасольства СССР у Польшчы высока ацаніла правядзенне «Дзён беларускай культуры» і адзначала:

> Апошняя дэкада месячніка польска-савецкага сяброўства, якая была прысвечана беларускай культуры, з'явілася самым цікавым мерапрыемствам месячніка. Падобнага кшталту мерапрыемстваў не праводзіліся да сяго часу ні толькі ў Польшчы, але і ў іншых краінах народнай дэмакратыі. Правядзенне гэтай дэкады з'яўляецца яскравым прыкладам вялізнай цікавасці польскай грамадскасці і працоўных Польшчы да жыцця і дасягненняў не толькі ўсяго Савецкага Саюза, але і асобных союзных рэспублік[31].

Разам з правядзеннем «Дзён…» у Польшчы, у Беларусі 1 кастрычніка 1955 г. упершыню быў адкрыты месячнік савецка-польскага сяброўства. Мэтай яго правядзення з'яўлялася: «*Папулярызацыя міралюбівай савецкай палітыкі, растлумачванне ролі і зместу савецка-польскай салідарнасці для сацыялістычнага будаўніцтва ў Польшчы і незалежнасці краіны, шырокага азнаямлення з дасягненнямі савецкага народа на шляху да камунізму*»[32]. Нягледзячы на прапагандысцкі характар і мэтавую накіраванасць месячніка, шматлікія артыкулы, інтэрв'ю з польскімі грамадскімі, палітычнымі дзеячамі, прадстаўнікамі культуры, выступленні творчых калектываў знаёмілі беларускую грамадскасць з важнейшымі падзеямі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага жыцця Польшчы і польскага народа.

У гэты дзень у Мінск прыбыла польская дзяржаўная дэлегацыя, якую ўзначаліў міністр асветы ПНР В. Ярасінскі. У Дзяржаўным тэатры оперы і балета адбыўся вечар савецка-польскага сяброўства, на якім прысутнічалі польскія госці на чале з В. Ярасінскім, са-

[30] НАРБ, ф. 4п, воп. 62, спр. 431, л. 304.
[31] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 78.
[32] "Советская Белоруссия" 1955, 9 сентября.

кратары ЦК КПБ Цімафей Гарбуноў, Ціхан Кісялеў, віцэ-прэзідэнт АН БССР Іван Лупіновіч, старшыня Белсаўпрофа Іосіф Бельскі, намеснік міністра культуры П. Лютаровіч і інш. З дакладам «Непарушнае сяброўства польскага і савецкага народаў» выступіў Пятро Глебка.

Да месячніка савецка-польска сяброўства Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў БССР арганізавала цыкл лекцый, прысвечаных гісторыі ПНР. Рэспубліканскае таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў выдала ў дапамогу прапагандыстам лекцыю «Поспехі працоўных ПНР у будаўніцтве сацыялізму»[33]. У час месячніка ў Беларусі ўпраўленне радыёінфармацыі арганізавала перадачу 12 канцэртаў польскай музыкі, 11 літаратурных перадач і 6 перадач аб Польшчы для юнакоў і дзяцей. З 3 па 9 кастрычніка ў Мінску праходзіў фестываль польскіх фільмаў, у Доме афіцэраў была адкрыта фотавыстава «10 год Народнай Польшчы», на старонках рэспубліканскіх газет «Савецкая Беларусь», «Звязда», «ЛІМ», «Сталінская моладзь», «Чырвоная змена» у час месячніка было надрукавана 96 артыкулаў аб гаспадарчым і культурным развіцці Польскай Народнай Рэспублікі[34].

Надалей месячнікі пачалі праводзіца на рэгулярнай аснове і, што вельмі важна, набылі прававую аснову, рэгулюючую іх дзенасць. Упершыню 21 мая 1958 г. у Мінску быў падпісаны пратакол паміж БТКСЗ і таварыствам польска-савецкага сяброўства, у адпаведнасці з якім была праведзена дэкада беларускай культуры ў Польшчы, а польскай культуры ў БССР[35]. Прэса БССР шырока асвятляла “Дні польскай культуры ў БССР”, якія праходзілі “*у рэспубліцы пад знакам далейшага развіцця дружалюбных адносін паміж польскім і савецкім народам*”[36]. У Мінск прыбыла прадстаўнічая польская дэлегацыя, якую ўзначальваў намеснік міністра культуры і маста-

[33] “Советская Белоруссия” 1955, 29 сентября.
[34] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 31.
[35] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 75, л. 10.
[36] “Мінская праўда” 1958, 17 чэрвеня.

цтва ПНР Эдвад Мажац, а ў склад дэлегацыі ўваходзіў сакратар Галоўнага праўлення ТПСС Тадэўш Ксенжак, прафсар Познаньскага ўніверсітэта Ежы Ламніцкі, рэдактар часопіса "Пшыязнь" Сільвія Гвіздалава і іншыя. Адзначым, што агульным лозунгам, пад якім праходзілі ўсе мерапрыемствы быў лозунг "польска-савецкага сяброўства" і "сяброўства паміж польскім і савецкім народамі". Аб развіцці "польска-беларускага сяброўства" гаворка не вялася. Спецыяльна для "Дзен…" была адкрыта выстава ў бібліятэцы імя Леніна твораў польскіх пісьменнікаў і паэтаў – Адама Міцкевіча, Баляслава Пруса, Марыі Канапніцкай і іншых. Падкрэслівалася, што "*Выстаўка адлюстроваўе цесныя брацкія сувязі, якія існуюць паміж польскім і савецкім народамі*"[37].

Значную ўвагу ў беларуска-польскім культурным дыялогу набыло святкаванне юбілейных дат. У сакавіку 1955 г. адбыліся ўрачыстасці са дня 145-годдзя нараджэння Фрэдэрыка Шапэна. Белдзяржфілармонія арганізавала ўрачысты канцэрт з дня гэтай нагоды. Белдзяжфілармонія і музычныя вучэльні правялі лекцыі-канцэрты, прысвечаныя жыццю і творчасці вялікага польскага кампазітара[38].

Адной з першых і шырока адзначаемых дат стала правядзенне 100-леццця з дня смерці Адама Міцкевіча, якое адзначалася ў 1955 г. Ініцыятарам гэтая святкавання выступіла БТКСЗ. 6 лістапада 1955 г. яго старшыня Р. Верасаў накіраваў сакратару ЦК КПБ па ідэалогіі Ц. Гарбунову ліст, у якім прапанаваў адсвяткаваць 100-годдзе з дня нараджэння Адама Міцкевіча, улічаючы, што ён нарадзіўся і правёў юнацкія гады на тэрыторыі сучаснай Беларусі[39].

БКТСЗ прапанавала правесці ў жніўні 1955 г. выязную сесію АН БССР і запрасіць на яе вучоных з Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны, уключыць у план Беларускага дзяржаўнага выдавецтва

---

[37] "Мінская праўда" 1958, 18 чэрвеня.
[38] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 86.
[39] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 77, л. 48.

выданне ў 1955 г. 4-х томніка твораў А. Міцкевіча на беларускай мове, Міністэрству культуры запланаваць у жніўні адкрыць у Навагрудку музей паэта, акрамя гэтага планавалася прысвоіць імя А. Міцкевіча сярэдняй школе і гарадской бібліятэцы Навагрудка, паставіць у Навагрудку бюст паэту, даручыць Гродненскаму і Брэсцкаму аблвыканкамам упарадкаваць усе мясціны, звязаныя з імём Адама Міцкевіча і устанавіць на іх мемарыяльныя знакі. У лістападзе планавалася правесці ўрачысты вечар з нагоды 100-годдзя з дня смерці паэта[40].

На гэтыя святкаванні прыехалі паэты і пісьменнікі з усяго Савецкага Саюза, а таксама з Польшы. 29 лістапада 1955 г. у Мінску ў театры оперы і балета адбыўся ўрачысты вечар, на якім прысутнічалі сакратары ЦК КПБ Цімох Гарбуноў, Ціхан Кісялёў, намеснік Старшыні СМ БССР Кацярына Уралава, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, рабочыя мінскіх прадпрыемстваў, дэлегацыі з Масквы, Ленінграда, Украіны і Літвы[41]. 30 лістапада святкаванні адбыліся на радзіме А. Міцкевіча ў Навагрудку. Крыху раней, 26 лістапада адбылося ўрачыстае адкрыцце Навагрудскага дома-музея А. Міцкевіча. Рэспубліканскія СМІ надрукавалі вялікую кольскасць матарыялаў, якія былі прысвечаны творчасці Адама Міцкевіча[42].

У 1957 г. у ПНР шырока адзначалася 75-годдзе з дня нараджэння Народнага пісьменніка БССР Янкі Купалы. 23 чэрвеня 1957 г. у Беластоку адбыўся агульнагарадскі ўрачысты сход, прысвечаны памяці Я. Купалы, на якім выступілі дэлегаты з Беларусі[43]. Падкрэслівалася, што цэнтральныя газеты Польшчы надрукавалі матарыялы, прысвечаныя яго творчасці.

Развіццю супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы садзейнічала падпісанне 29 лістапада 1957 г. у Варшаве «Пратакола аб выніках работы савецка-польскай змешанай Камісіі па выпрацоўцы плана

[40] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 77, лл. 39–40.
[41] НАРБ, ф. 914, воп. 1, спр. 76, л. 196.
[42] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 54, л. 86.
[43] “Літаратура і Мастацтва” 1957, 29 чэрвеня.

рэалізацыі дагавора аб культурным супрацоўніцтве паміж СССР і ПНР на 1958 г.»[44]. У прэамбуле пратакола адзначалася, што быў падпісаны план супрацоўніцтва, які ахоплівае шырокае кола пытанняў культуры і мастацтва, вышэйшай адукацыі, друку, радыёвяшчання і тэлебачання, грамадскіх арганізацый і творчых саюзаў. Падпісанне «Пратакола…» мела важнае значэнне, па-першае, што супрацоўніцтва ў культурнай галіне ўпершыню ў двухбаковых савецка-польскіх узаемаадносінах абапіралася на трывалую нарматыўна-прававую базу, якая мела міждзяржаўны ўзровень. Па-другое, у «Пратаколе…» асабліва падкрэслівалася, што адпаведныя дзяржаўныя органы абедзьвух краін будуць аказваць садзейнічанне і дапамогу творчым саюзам, грамадскім арганізацыям у развіцці гэтага супрацоўніцтва. Важным з’яўлялася і дзяржаўнае фінансаванне культурных мерапрыемстваў.

21–24 мая 1958 г. у Мінску паміж БТКСЗ і ТПСС быў падпісаны Пратакол, які вызначаў план мерапрыемстваў у галіне культурнага абмену на 1959 г. У ім, у прыватнасці, прадугледжваўся: «*абмен дэлегацыямі культурных дзеячаў, работнікаў навукі, архітэктараў, спартыўных каманд*»[45]. Падпісанне пратаколаў аб культурным супрацоўніцтве сведчыла аб выхадзе на новы міждзяржаўны ўзровень беларуска–польскіх узаемаадносін, бо фарміравала іх прававую базу. Значэнне гэтага пратакола высока ацэнівала МЗС СССР, якое адзначала, што: «*У 1958 г. упершыню пачаў ажыццяўляцца непасрэдны абмен паміж Беларускай ССР і Польшчай у адпаведнасці з пратаколам, падпісаным у Мінску прадстаўнікамі БТКСЗ і Таварыства польска-савецкага сяброўства*»[46]. У адпаведнасці з гэтым пратаколам была праведзена дэкада беларускай культуры ў ПНР і польскай культуры ў БССР[47], узаемны абмен дэлегацыямі

[44] О.Н. Важник, *БССР и Польская Народная Республика: экономические, научно–технические и культурные связи в 1949–1979 гг.,* Минск 2008, с. 16.

[45] “Советская Белоруссия” 1958, 25 мая.

[46] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 83, л. 10.

[47] «Літаратура і Мастацтва» 1958, 21 чэрвеня.

і мастацкімі калектывамі[48], абмен групамі вучоных, архітэктараў, маладзёжнымі дэлегацыямі[49], спартыўнымі калектывамі, дэлегацыямі аўтамабільных і матацыклетных заводаў Мінска і Варшавы».

Развіццё культурнага супрацоўніцтва з Польшчай мела ярка выражаны палітыка-ідэалагічны характар. Так, старшыня БТКСЗ Р. Верасаў у лісце першаму сакратару ЦК КПБ Кірылу Т. Мазураву адзначаў, аналізуючы культурны абмен паміж БССР і ПНР, што:

> У Польшчы актыўнейшай сілай рэакцыі з'яўляецца даволі значная частка творчай інтэлігенцыі. Адной з важнейшых форм палітычнай дзейнасці рэакцыі ў Польшчы, скіраванай супраць сацыялізму і на ідэалагічны адрыў ад дэмакратычнага лагеру, з'яўляецца барацьба супраць сацыялістычнага рэалізму. У сувязі з гэтым неабходна актывізаваць культурныя сувязі з Польшчай Саюзу пісьменннікаў БССР, Саюзу мастакоў БССР, Саюзу архітэктараў, Дому народнай творчасці[50].

Гэта дамінанта з'яўлялася вызначальнай і да канца даследуемага перыяду. Так, у справаздачным дакладзе па выніках працы БАТСПС за 1958 г. падкрэслівалася, што:

> Галоўная ўвага ў сваей працы надавалася арганізацыі абмену вопытам сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. З гэтай мэтай у ПНР высылаліся розныя інфармацыйныя і прапагандысцкія матэрыялы, выстаўкі, літаратура, кінафільмы, музыкальныя выданні і г. д. Гэтай жа мэце быў падпарадкаваны абмен дэлегацыямі, лектарамі і турысцкімі групамі[51].

Беларуска-польскія культурныя ўзаемадачыненні развіваліся неадназначна. Развіццё культуры ў СССР у рамках «сацыялістычнага рэалізму» не давала магчымасці абодзьвум народам знаёмству з творамі, якія адрозніваліся ад гэтага прынцыпу. Адбор літаратуры

---

[48] "Советская Белоруссия" 1958, 14 июня.
[49] "Гродненская правда" 1958, 22 июня.
[50] НАРБ, ф. 914, воп. 2, спр. 83, л. 41
[51] НАРБ, ф. 914, воп. 3, спр. 58, л. 25.

для абмену з абодвух бакоў ажыццяўляўся толькі па ўзгадненні з партыйнымі структурамі. Значнае месца ў літаратурным абмене, асабліва з боку БССР, займала грамадска-палітычная і агітацыйна-прапагандысцкая літаратура, якая прапагандавала «дасягненні і перавагі сацыялістычнага» будаўніцтва ў Беларусі. Адметнай рысай культурнага ўзаемаабмену стала замоўчванне вострых праблем ва ўзаемаадносінах паміж польскім і беларускім народамі ў мастацкіх творах. Нязначнае месца беларускай мовы ў культурным жыцці Беларусі было абумоўлена тым фактам, што польскі чытач асобна не вылучаў і не адрозніваў беларускую савецкую культуру ад агульнасаюзнай культуры і культурных працэсаў, якія адбываліся ў Савецкім Саюзе. У той жа час, нягледзячы на значныя ідэалагічныя абмежаванні ў галіне культуры, агульныя культурныя кантакты, блізкасць і роднасць культур садзейнічалі працэсу азнаямлення абодвух народаў з іх культурнымі дасягненнямі.

## Bibliografia


Arhiu Ministerstwa inostrannyh del Respubliki Belarus (AMZSRB), f. 3, op. 3, d. 341 (Voprosy kulturnoj sviazi s zagranicej) [Архив Министерства иностранных дел Республики Беларусь (АМИД РБ), ф. 3, оп. 3, д. 341. Вопросы культурной связи с заграницей. Январь 1956 г. – август 1956 г.].

Vaznik O.N., *BSSR I Polskaja Narodnaja Respublika: ekonomiczeskie, naucznotehniczeskie i kulturnye sviazi v 1949–1979 gg.,* Minsk 2008 [Важник, О. Н. *БССР и Польская Народная Республика: экономические, научно–технические и культурные связи в 1949–1979 гг.*: Минск 2008].

Vojtovicz S., Vorobej N., Tolstoj V. *Sotrudniczestvo Belorusskoj SSR s socialisticzeskimi stranami*, Minsk 1970 [Войтович С., Воробей Н., *Толстой В. Сотрудничество Белорусской ССР с социалистическими странами,* Минск 1970].

Grodnenskaja Pravda" 1958, 22 ijunia ["Гродненская правда": 1958, 22 июня].

*Dokumenty I materialy po istorii sovetsko-polskih otnoszenij T.X. janvar 1950 g. – dekabr 1955 g.,* Moskwa 1980. [*Документы и материалы по истории советско-польских отношений T.X. январь 1950 г. – декабрь 1955 г.,* Москва 1980].

"Litaratura i mastactwa" 1957, 29 czervenia ["Літаратура і Мастацтва" 1957, 29 чэрвеня].

"Litaratura i mastactwa" 1958, 21 czervenia ["Літаратура і Мастацтва" 1958, 21 чэрвеня].

„Minskaja Pravda" 1958, 18 czervenia ["Мінская праўда" 1958, 18 чэрвеня].

„Minskaja Pravda" 1958, 17 czervenia ["Мінская праўда" 1958, 17 чэрвеня].

Navicki U.I., *Belaruska-polskija kulturnyja suviazi (siaredzina 50-h – siaredzina 80-h gg.)* [w] *XX stagoddze u gistoryi Paljakau I Belarusau: materialy Belaruska-Polskaj navukovaj kanferencyi,* Minsk 20-21 listapada, 2000, Minsk 2001 [Навіцкі, У. І., *Беларуска–польскія культурныя сувязі (сярэдзіна 50–х – сярэдзіна 80–х гг. XX ст.),* Мінск, 2001].

Nacionalnyj arhiv Respubliki Belarus (NARB), f.4p, op. 62, d.304 (Dokladnye zapiski, spravki i postanovlenija obkomov partii i ministerstv BSSR po voprosam nauki, kultury I iskustva. 7 janvaria1955 g. – 10 oktiabrja 1955 g. [Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф.4п, оп. 62, д. 431. Докладные записки, справки и постановления обкомов партии и министерств БССР по вопросам науки, культуры и искусства. 7 января 1955 г. – 10 октября 1955 г.].

NARB, f.4p, op. 73, d.67 (Spravki o sostojanii tvorczeskih organizacij respubliki. 18 dekabrja 1954 g. – 15 dekabrja 1955 g. [НАРБ, ф.4п, оп. 73, д. 67. Справки о состоянии творческих организаций республики. 18 декабря 1954 г. – 15 декабря 1955 г.].

NARB, f.4p, op. 97, d.10 (Spravki otdelov KC KPB v sviazi s zaprosami partijnyh I sovetskih organov po voprosam propagandy I agitacii v respublike. 3 janvaria 1956 g. – 27 dekabria 1956 g.) [НАРБ, ф. 4п, оп.97, д. 10. Справки отделов ЦК КПБ в связи с запросами партийных и советских органов по вопросу состояния агитации и пропаганды в республике. 3 января 1956 г. – 27 декабря 1956 г.].

NARB, f.914p, op. 1, d.76 (Perepiska s pravleniem VOKS o kulturnyh sviazijah i drugim voporsam. 6 janvarja 1955 g. – 3 dekabrja 1955 g.) [НАРБ, ф. 914, оп.1, д.76. Переписка с правлением ВОКС о культурных связях и другим вопросам. 6 января 1955 г. – 3 декабря 1955].

NARB, f.914p, op. 1, d.77 (Perepiska s KC KPB i SM BSSR o kulturnyh sviazijah. 6 janvaria 1955 g. – 31 dekabrja 1955 g. [НАРБ, ф. 914, оп.1, д.77. Переписка с ЦК КПБ и СМ БССР о культурных связях и др. 6 января 1955 г. – 31 декабря 1955 г.].

NARB, f.914p, op. 1, d.87 (Materialy o druzeskih i kulturnyh sviazjah s organizacijami i czastnymi licami stran narodnoj demokratii (PNR). 4 janvaria 1957 g. – 21 dekabria 1957 g.) [НАРБ, ф. 914, оп.1, д.87. Материалы о дружеских и культурных связях с организациями и частными лицами стран народной демократии (ПНР). 4 января 1957 г. – 21 декабря 1957 г.].

NARB, f.914p, op. 1, d.89 (Materialy o druzeskih i kulturnyh sviazjah s organizacijami i czastnymi licami stran narodnoj demokratii (PNR). 11 janvaria 1955 g. – 20 oktjabria 195 g.) [НАРБ, ф. 914, оп.1, д.89. Материалы о дружеских и культурных связях с организациями и частными лицами стран народной демократии (ПНР). 11 января 1955 г. – 20 октября 1955 г.].

NARB, f.914p, op. 2, d.20 (Spravki, dokladnyje zapiski napravlennye v KC KPB i SM BSSR po voprosam kulturnyh sviziej s zarubeznymi stranami. 10 marta 1953 g. – 9 dekabria 1953 g. [НАРБ, ф. 914, оп.2, д.20. Справки, докладные записки, направленные в ЦК КП(б)Б и СМ БССР по вопросам культурных связей с зарубежными странами. 10 марта 1953 г. – 9 декабря 1953 г.].

NARB, f.914p, op. 2, d.34 (Dokladnaja o prebyvanii a Belorussii delegacii obsczestva polsko-sovietskoj druzby. 20 janvaria 1954 g. – 28 dekabria 1954 g.) [НАРБ, ф. 914, оп. 2, д. 34. Докладная о пребывании в Беларуси делегации общества польско-советской дружбы. 20 января 1954 г. – 28 декабря 1954 г.].

NARB, f.914p, op. 2, d.54 (Belorusskoe obsczestvo kulturnyh sviazej s zagranicej. 6 janvaria – 1955 g. – 31 dekabria 1956 g.) [НАРБ, ф. 914, оп. 2, д. 54. Белорусское общество культурных связей с заграницей. 6 января 1955 г. – 31 декабря 1956 г.].

NARB, f.914p, op. 2, d.75 (Vypiska iz spravki o polozenii nacmenszinstv v Polsze. 1958 g. [НАРБ, ф. 914, оп. 2, д. 75. Выписка из справки о положении нацменьшинств в Польше. 1958 г.].

NARB, f.914p, op. 2, d.83 (Otczet o rabote Belorusskogo obsczestva druzby I kultornoj sviazi s zagranicznymi stranami. 1 janvaria – 31 dekabria 1959 g.) [НАРБ, ф. 914, оп. 2, д. 83. Отчет о работе Белорусского общества дружбы и культурной связи с зарубежными странами. 1 января – 31 декабря 1959 г.].

NARB, f.914p, op. 3, d.58. (Materialy o sozdanii I rabote jrdelenij obsczestva sovetsko-polskoj druzby na predprijatijah, v kolhozah, sovhozah, gorodah I oblastiah. Janvar 1960 – 30 nojabria 1960 g. [НАРБ, ф. 914, оп. 3, д. 58. Материалы о создании и работе отделений общества советско-польской дружбы на предприятиях, в колхозах, совхозах, городах и областях. Январь 1960 – 30 ноября 1960 г.].

“Sovetskaja Belorussija” 1955, 29 sentijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 29 сентября].

“Sovetskaja Belorussija” 1955, 9 sentijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 9 сентября].

“Sovetskaja Belorussija” 1955, 30 sentijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 30 сентября].

“Sovetskaja Belorussija” 1955, 1 oktijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 1 октября].
“Sovetskaja Belorussija” 1955, 5 oktijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 5 октября].
“Sovetskaja Belorussija” 1955, 8 oktijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 8 октября].
“Sovetskaja Belorussija” 1955, 11 oktijbria [“Советская Белоруссия” 1955, 11 октября].
“Sovetskaja Belorussija” 1958, 25 maja [“Советская Белоруссия” 1958, 25 мая]
“Sovetskaja Belorussija” 1958, 14 ijunia [“Советская Белоруссия” 1958, 14 июня].

**Belarusian-Polish cultural cooperation in the mid-late 1950s.**

A characteristic feature of Belarusian-Polish relations in the mid-late 1950-th was cultural cooperation. This was explained by the common historical, geographical, linguistic and family ties between the Polish and Belarusian peoples. At the same time, the prevailing principle of „socialist realism" in the USSR influenced the development of cultural relations. A characteristic feature of the cultural exchange between the Polish and Belarusian peoples was the suppression of sharp gaps in works of art. The insignificant place of the Belarusian language in the cultural life of Belarus led to the fact that the Polish reader did not single out and did not distinguish the Belarusian Soviet culture from the all-Union and cultural processes that took place in the Soviet Union.

Keywords: Belarusian-Polish cultural ties, „socialist realism", Days of Belarusian culture, Belarusian-Polish society, cultural exchange